Мільён дзяцей моліцца на Ружанцы!

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
10.10.2021 00:00



Дзеці з усіх кантынетаў злучацца ў Ружанцовай малітве 18 кастрычніка, у Дзень св. евангеліста Лукі, які распавёў гісторыю дзяцінства Езуса і, паводле традыцыі, лічыцца асобай, блізкай Маці Божай. Упершыню ў акцыі “Мільён дзяцей моліцца на ружанцы” прымуць удзел і ўсе дыяцэзіі нашай краіны. Хлопцы і дзяўчаты злучацца ў малітве ў адной супольнай інтэнцыі – будуць прасіць аб міры і еднасці ў свеце. Адказныя за акцыю асобы з кожнай дыяцэзіі арганізуюць групу дзяцей і іх бацькоў у галоўнай святыні дыяцэзіі. Гэтыя групы будуць бачыць і чуць адзін аднаго праз тэлемост, праводзячы загадзя падрыхтаваную сваю частку Ружанца. Таксама будзе ісці агульная анлайнтрансляцыя мерапрыемства з Мінска, з пляцоўкі ля Хрысціянскага Сацыяльнага Цэнтра. Анлайн-трансляцыя дасць магчымасць далучыцца да акцыі тым, хто плануе збірацца на малітву ў сваім мясцовым касцёле, а не ў цэнтральнай дыяцэзіяльнай святыні. † У нашай дыяцэзіі цэнтрам правядзення акцыі адпаведна будзе гродзенскі касцёл св. Францішка Ксаверыя, а адказны – вікарый парафіі кс. Яўген Амасёнак.

Са слоў святара, на момант напісання матэрыялу, дзяцей з Гродзенскай дыяцэзіі, ахвотных памаліцца Ружанцам разам з усім светам, налічылася амаль 2 000, што не з’яўляецца канчатковай лічбай. Усім хлопцам і дзяўчатам напярэдадні акцыі прапануецца паўдзельнічаць у майстар-класе па вырабе ружанцаў, а пасля – падорыць самастойна змайстраваны ружанец дзіцяці побач. Ад арганізатараў акцыі кожны ўдзельнік атрымае марыйныя ружанцовыя налепкі.

“Я бачу, што дзеці сапраўды разумеюць, што адбываецца ў свеце: што людзі пакутуюць ад пандэміі, што ёсць тыя, хто галадае, што ёсць войны і крызісы. І яшчэ яны разумеюць, што калі хтосьці пакрыўджаны, трэба прасіць у Бога аб дапамозе для гэтага чалавека. Таму, канешне, ім цікава атрымаць падарункі, але

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
10.10.2021 00:00

яны сапраўды аб'яднаны мэтай – разам прасіць аб супакоі і адзінстве", – упэўнены кс. Яўген.

Каб акцыя "Мільён дзяцей моліцца на ружанцы" сабрала неабходную, а то і большую колькасць дзяцей па ўсім свеце, далучайцеся да яе духоўна 18 кастрычніка а 18-ай гадзіне вечара беларускага часу або з дапамогай сродкаў анлайнсувязі (падрабязнасці на інтэрнэт-старонцы samaranin.by). Усе неабходныя матэрыялы можна таксама знайсці на партале, прысвечаным міжнароднай акцыі "One Million Children Praying the Rosary".

– Кс. Яўген, чым дзіцячая Ружанцовая малітва адрозніваецца ад малітвы дарослых?

– Дзеці маюць чыстыя сэрцы, таму і малітва ў іх атрымліваецца вельмі шчырая і даверлівая. Яе галоўная асаблівасць у тым, што яна не спыняецца. Дарослым уласціва апускаць рукі, калі малітва не прыносіць пажаданы плён, дзеці ж будуць яе працягваць. Гэта мы бачым і на прыкладзе фацімскай гісторыі.

– Ружанец – працяглая малітва, якая патрабуе вялікай канцэнтрацыі. Трэба ўмець засяроджвацца на словах самой малітвы, адначасова разважаць Таямніцы і пры гэтым памятаць пра інтэнцыю. Ці гатова малое ўспрыняць такую малітву? Ці ўвогуле правільна "грузіць" Ружанцам дзіця, а не пачаць, напрыклад, з падлеткавага, свядомейшага ўзросту?

– Па-першае, праблема не ў тым, што Ружанец – гэта працяглая малітва, а ў тым, што ў нашым жыцці надта шмат мітусні і нам увогуле складана знайсці вольны час. У дзяцей няма столькі клопатаў, якія перашкаджалі б выдзеліць час на малітву. І няма столькі крыўд ды правін, што "ўсплываюць" акурат падчас Ружанца і часта замінаюць маліцца дарослым.

Па-другое, падчас малітвы дзецям неабвязкова выходзіць на ўзровень медытацыі над святымі таямніцамі. Як бацькам прыемна і важна, што іх малы проста што-небудзь гаворыць ім, нават нейкую лухту, так і Бог мае патрэбу, каб дзеці звярталіся да Яго, няхай і не да канца ўсведамляючы сэнс сказанага. Для Госпада лічыцца прысутнасць, хай нават дзіця азіраецца навокал падчас малітвы.

Мільён дзяцей моліцца на Ружанцы!

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
10.10.2021 00:00

